# Гаспадар

***Рыгор Барадулін***

Так і чуецца ў слове *Господні дар*, Божы дар, бо добрым *гаспадаром* быць — гэта трэба мець талент.

*Гаспадар* — чалавек, які нечым валодае, нечым распараджаецца, пра нешта руліцца, вядзе *гаспадарку*, і любая *гаспадарка* — галоўны клопат *гаспадара*. Жытло *гаспадарова* з усімі прыбудовамі недарэмна ўзвышана называецца *гасподай*. Мужчына мусіць быць *гаспадаром* свайго слова, *гаспадаром* свайго дому. *Гаспадаром* жонка называе мужа.

У даўніну дзяржава называлася *гаспадарствам*. Памятаеце, як пачынаюцца казкі? У некаторым царстве, у некаторым *гаспадарстве*... І ўладароў Малдовы і Валахіі велічалі *гаспадарамі*.

*Гаспадар* — чалавек незалежны, у адрозьненьне ад люмпэна. На *гаспадарох* трымаецца нармальная дзяржава, жыцьцё будзённае і асяжныя мроі.

Калядоўшчыкі, прыйшоўшы ў *гаспадароў* двор, песьню звычайна пачыналі: *„Гаспадарочак, сьлічны паночак...“*. І паважная форма зьвяртаньня да каго-небудзь — *„спадар“* — таксама ад слова *гаспадар*.

Без *гаспадара* і нізінай стане гара. А над усімі намі, над усім сьветам — адзін *Гаспадар* Усявышні — *Госпад*.

# Гета

***Юрась Бушлякоў***

Да XX стагодзьдзя *гетаў* у нашым краі ня ведалі. *Геты* былі на Захадзе, былі на Ўсходзе, але ня ў нас. Само слова гэтае — *гета* — прабіралася да нас з Эўропы: з эўрапейскіх моваў першаю зьведала яго італійская — на Апэнінскі паўвостраў прынесьлі слова разам з сабою габрэі. Выпадала ім, найчасьцей з прымусу, ізаляцыя — заставалася для іх *гета*. *Гета* на смутак і на радасьць, на добрае й благое, *гета* як прыпынішча сярод чужых, як выспа свайго парадку.

У беларускіх местах было горай — *геты* пазаводзілі акупанты ў часе апошняе вайны. Кожны ў нас ведае, куды вяла дарога з тых *гетаў*. *Геты* пладзілі горыч, у *гетах* цярпелі людзі — у *гетах* раскашаваў страх і віжавала сьмерць. Быў гэта сьвет, у якім ня будзеш рады сьвету. Сьвет, калючым дротам аддзелены ад таго жыцьця, дзе блазнуюць на карусэлях гулякі ды вецер разьвявае жанчынам сукенкі... У безнадзейным сьвеце *гета* жылі ў надзеі загнаныя сьляпою сілай у пастку людзі — на гэнай вайне яны былі найпершымі з ахвяраў...

Вось чаму цягам усіх паваенных дзесяцігодзьдзяў, ажыўляючы ў памяці гэтае прышлае слова *гета*, наш чалавек звычайна не зьвяртаецца па прыклады здалёк. Навуку спачуваць і памагаць мы праходзім, дазнаючыся пра кашмар, сьведкі якога пакуль яшчэ ёсьць сярод нас.

# Гешэфт

***Алена Ціхановіч***

*Гешэфты* — асноўны занятак гандляроў, перакупшчыкаў. Зрэшты, гэта шырэй, чым гандаль — любыя зьдзелкі, у аснове якіх — асабісты інтарэс.